«Народная Воля» в Facebook www.facebook.com/nv.online.info
в Vkontakte www.vk.com/nvonlineinfo

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 65 (4625)

27 жніўня 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.





Народная Воля

25 жніўня 1991 года Вярхоўны Савет БССР надаў Дэкларацыі аб суверэнітэце канстытуцыйны статус.

З 30-годдзем Незалежнасці Беларусі!



ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

Не губляйце сувязі з «Народнай Воляй»!

Шаноўныя прыхільнікі «Народнай Волі»!

Мы разумеем, якую ролю ў Вашым жыцці адыгрывае незаангажаванае **свабоднае СЛОВА**, якое не прайшло праз абмежаванні жорсткай цэнзуры.

Такое **свабоднае СЛОВА** вось ужо 27-ы год даносіць «Народная Воля». І рэдакцыя прыкладае ўсе высілкі для таго, каб наша і ваша газета як мага хутчэй змагла друкавацца на паперы і даходзіць да чытачоў у ранейшым варыянце. На жаль, пакуль нам адмоўлена ў паліграфічных паслугах як у Беларусі, так і ў Расіі. А таму працягваем выдаваць «Народную Волю» ў электронным варыянце. Вядома ж, не ўсе Вы, сябры, карыстаецеся камп'ютарам. Але выйсце ёсць: не можа быць, каб нехта з Вашых родных, сяброў, суседзяў, саслужыўцаў не быў у ладах з сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі. Папрасіце іх, каб яны за Вашы сродкі падпісалі Вас на PDF-версію газеты, і ўжо праз іх Вы зможаце атрымліваць самыя свежыя нумары «Народнай Волі» ў раздрукаваным выглядзе.

Падпісацца на PDF-версію «Народнай Волі» можна на сайце ***belpressa.by***. Для гэтага трэба зайсці на сайт ***belpressa.by***, націснуць укладку ***«2021»*** і выбраць месяцы, на якія вы будзете афармляць падпіску.

Паколькі рэдакцыя ўжо каторы месяц не мае даходаў ад рэалізацыі выдання праз «Белпошту» і «Белсаюздрук», то мы рэальна зацікаўлены ў павелічэнні падпісчыкаў на PDF-версію.

Асобна звяртаемся да тых, хто мае магчымасць праявіць адрасную дабрачыннасць. Ёсць некалькі спосабаў пералічыць грашовыя сродкі (даём рэквізіты ў рускамоўным варыянце) на рэдакцыйны рахунак.

1.Через ЕРИП:

СМИ – Н (просто буква) – «Народная Воля» – Добровольные взносы.

2.Через БАНК:

ИЧУП «Народная Воля». 220030 г.Минск, ул.Энгельса, 34а

р/с BY08 PJCB 3012 0065 3510 0000 0933,

Код PJCBBY2X, ЦБУ 113 «Приорбанк» ОАО, г.Минск

УНП 100961759, ОКПО 37381505

Загадзя выказваем шчырую ўдзячнасць!

Вы – з «Народнай Воляй», «Народная Воля» – з Вамі!

РЭТРАСПЕКТЫВА

10 падзей і працэсаў, якія вызначылі і ўмацавалі беларускую незалежнасць цягам апошніх 30 гадоў

*Палітычны аглядальнік **Валерый Карбалевіч** напісаў пра 10 самых важных, на ягоны погляд, падзей, якія прадвызначылі 30-гадовую незалежнасць Беларусі.*



1. 25 жніўня 1991 года Вярхоўны Савет БССР пастанавіў надаць Дэкларацыі аб суверэнітэце БССР канстытуцыйны статус. Саму Дэкларацыю прынялі 27 ліпеня 1990 года. А рашэнне 25 жніўня 1991 года дэ-юрэ азначала абвяшчэнне незалежнасці. Таксама быў замацаваны прыярытэт беларускіх законаў над агульнасаюзнымі. Такім чынам дзень 25 жніўня стаў лёсавызначальным у заснаванні беларускай незалежнасці.

2. 19 верасня 1991 года Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР) была перайменавана ў Рэспубліку Беларусь. У гэты дзень былі прыняты новыя дзяржаўныя сімвалы: герб «Пагоня» і бел-чырвона-белы сцяг.

3. 8 снежня 1991 года былі падпісаны Белавежскія пагадненні, паводле якіх адбыўся роспуск СССР. Дакумент канстатаваў, *«што Саюз ССР як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыняе сваё існаванне»*. Белавежскія пагадненні былі ратыфікаваны Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 10 снежня 1991 года.

4. 15 сакавіка 1994 года Вярхоўны Савет прыняў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Дакумент набыў моц 30 красавіка 1994 года.

5. Пабудова інстытутаў незалежнай дзяржавы: прэзідэнт, урад, парламент, мясцовыя органы ўлады, судовая сістэма, войска, праваахоўныя органы, мытня, памежная служба, фінансавая сістэма, адукацыйная сістэма і іншыя.

6. Увядзенне сваіх грошай, афіцыйнай грашовай адзінкі Беларусі – беларускага рубля. Гэта адбылося ў 1992 годзе. Пытанне важнае таму, што цягам усіх 30 гадоў існавання незалежнай дзяржавы адбываецца замах на ўласную грашовую адзінку. Пакуль беспаспяховы.

У 1994 годзе падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі тагачасны прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч падпісаў дамову з урадам Расіі аб аб'яднанні грашовых сістэм.

Артыкул 13 падпісанай у 1999 годзе «Дамовы аб стварэнні саюзнай дзяржавы» Беларусі і Расіі прадугледжваў увядзенне адзінай грашовай адзінкі. 30 лістапада 2000 года ў Мінску было падпісана Міждзяржаўнае пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Расіяй аб увядзенні адзінай грашовай адзінкі і фарміраванні адзінага эмісійнага цэнтра «саюзнай дзяржавы». Яно прадугледжвала, што ролю адзінай грашовай адзінкі з 1 студзеня 2005 года павінен быў выконваць расійскі рубель, а з 1 студзеня 2008 года меліся ўвесці адзіную грашовую адзінку «саюзнай дзяржавы».

У 2019 годзе ўрады Беларусі і Расіі абмяркоўвалі 31 «дарожную карту» эканамічнай інтэграцыі. Якраз 31-я карта прадугледжвала пераход да адзінай валюты. Ці стаіць гэтае пытанне падчас сёлетняга абмеркавання 28 «дарожных карт», не паведамляецца.

7. Адмова Барыса Ельцына ў 1997–1999 гадах падпісваць ініцыяваныя Лукашэнкам дакументы. Нежаданне прэзідэнта РФ дапускаць Лукашэнку ў расійскую палітыку фактычна ўратавала незалежнасць Беларусі. Такі парадокс гісторыі.

8. Палітыка шматвектарнасці, якую праводзіў афіцыйны Мінск у 2014–2020 гадах, умацавала міжнародную суб'ектнасць Беларусі. Пазіцыя адноснага нейтралітэту ў канфлікце Расіі з Захадам і Украінай, тактыка балансавання паміж рознымі цэнтрамі сіл падвысіла аўтарытэт краіны ў свеце. Можна сказаць, што толькі ў гэтыя гады ў Беларусі з'явілася дыпламатыя.

9. Выбух масавых пратэстаў 2020 года стаў важнай праявай завяршальнага працэсу станаўлення беларускай нацыі. У процівагу рэжыму, які апелюе да савецкай традыцыі, пратэставае грамадства ўзяло на ўзбраенне традыцыйныя нацыянальныя сімвалы: бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня». На іх аснове фарміруецца новая (несавецкая) беларуская ідэнтычнасць. Пасіянарны выбух беларускага соцыуму – гэта своеасаблівая форма нацыянальна-вызвольнага руху.

10. Сам факт існавання незалежнай дзяржавы цягам 30 гадоў умацоўвае беларускую дзяржаўнасць. Проста ў выніку інерцыі палітычнага працэсу. З'явілася новае пакаленне беларусаў, якія выраслі ў суверэннай дзяржаве і не разумеюць саму пастаноўку пытання аб пагрозе незалежнасці. І чым больш будзе існаваць незалежная Беларусь, тым больш гарантыі незваротнасці яе дзяржаўнасці.

SOS!

Дефицит бюджета Беларуси за месяц вырос на треть

Дефицит республиканского бюджета в первом полугодии составил 1,561 млрд рублей, сообщает Минфин Беларуси. Страна снова больше тратит, чем зарабатывает. Только за май-июнь мы ушли в минус еще на полмиллиарда рублей.

Властей снова подвел рост расходов (плюс 17,4%) до 14,197 млрд рублей. Почти 60% из этих средств ушло на общегосударственную деятельность.

Примечательно также, что на обслуживание госдолга в январе–июне 2021 года ушло 1,18 млрд рублей. То есть это только выплата страны по процентам выданных нам кредитов. При этом доходы составили лишь 12,635 млрд, прибавив целых 22% к уровню первого полугодия прошлого года.


При этом основная часть заработанных в бюджет денег снова пришлась на налоги – 10,7 млрд рублей поступлений, что почти на треть больше, чем годом ранее.

Ранее сообщалось, что дефицит республиканского бюджета Беларуси в январе–мае был менее 1 млрд рублей (976,4 млн). Выходит, за май-июнь мы ушли в минус еще на полмиллиарда рублей.

РАЗВІТАННЕ

Памёр паэт Алесь Разанаў

*Перастала біцца сэрца **Алеся Разанава**. Ён – адзін з самых знакамітых беларускіх паэтаў усіх часоў. Яму было 73 гады.*



Выключаны з універсітэта ў 1969 годзе за патрабаванне навучання па-беларуску, ён не зламаўся. Ягоныя філасофскія вершы змянілі беларускую літаратуру.

Алесь Разанаў нарадзіўся 5 снежня 1947 года ў вёсцы Сяльцы, што ў Бярозаўскім раёне. У 1966 годзе паступіў на філфак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1968-м разам з іншымі студэнтамі-філолагамі падпісаў ліст на імя Пятра Машэрава з патрабаваннем весці выкладанне ва ўніверсітэце па-беларуску. Праз нейкі час быў адлічаны з БДУ.

Аўтар зборнікаў «Адраджэнне», «Назаўжды», «Шлях-360» ды іншых. Перакладаў творы многіх вядомых замежных аўтараў.

Бывай, творца! Няхай пухам будзе табе родная зямелька.

Бязмежжа

Палову жыцця падаюся ў свет,
палову – варочаюся са свету,
палову жыцця пішу на дарозе
свае імёны,
палову – закрэсліваю напісанае,
палову жыцця расту ад зямлі,
палову – расту з зямлёю:

і ўсё менш ува мне мяне, і ўсё больш бязмежжа.

***

Кожны народ мае хоць адзін геніяльны твор – мову.

***

Калі ўсе згублены ключы,
калі ні шанцу,
анічога –
усё ж ідзі,
любі,
крычы
і пасягай на перамогу.

Народная Воля http://www.nv-online.info 27 ЖНІЎНЯ 2021 г.

От редакции

В прошлом номере «Народная Воля» опубликовала мнение известных людей по поводу информации о том, что медиаменеджера, создательницу белорусского «Пресс-клуба» Юлию Слуцкую после ареста непрерывно допрашивали 36 часов. «Народная Воля» решила ближе познакомить своих читателей с этой знаковой особой белорусской журналистики.

ИЗ ПРЕССЫ

«Это человек, который может возрождаться и начинать всё с нуля»

Юлия Слуцкая – известный медиаменеджер и создательница белорусского «Пресс-клуба». В журналистику она пришла в 1994 году. За 26 лет работы ей несколько раз приходилось начинать свое дело с нуля и практически каждый раз – после очередных президентских выборов.



«Когда Юля ушла из «Комсомолки», было ощущение, что земля ушла из-под ног»

По образованию Юлия Слуцкая социолог – она окончила философский факультет Белорусского государственного университета. В 1994 году пришла в «БелКП-Пресс» на позицию социолога. Спустя несколько месяцев стала главным редактором «Комсомольской правды» в Беларуси».

К тому моменту, как вспоминала Юлия Слуцкая в интервью для *baj.by*, тиражи «Комсомольской правды» сильно обвалились. В 1989–1990 годах они достигали 1 миллиона экземпляров, в 1994-м еженедельный выпуск расходился тиражом максимум в 30 тысяч, а ежедневный – около 4–5 тысяч.

В "Комсомолке" Юлия проработала до 2006 года. За это время она с нуля разработала концепцию белорусской версии издания, создала команду и подняла тиражи в более чем десять раз – до 330 тысяч экземпляров «толстушки».

Виктор Малишевский познакомился с Юлией Слуцкой в 1994 году. В каких обстоятельствах – уже точно и не вспомнит.

– Тогда я был студентом, приносил свои статьи в редакцию. Примерно в такой ситуации и познакомились. Позже стали работать вместе.

По воспоминаниям Виктора, белорусский контент в «Комсомолке» на тот момент занимал всего пару *«не сильно концептуальных»* страниц. Вместе с Юлией они думали над тем, как может выглядеть белорусская версия газеты.

– Разработали схему, придумали рубрики, набрали сильную команду. В результате оттуда вышло много известных журналистов, которые сейчас работают в разных СМИ.

Сперва белорусский контент в «Комсомолке» занимал четыре страницы, затем – в два раза больше и в конце концов занял половину газетных полос.

– Мы перекраивали российскую «Комсомолку» под себя, – рассказывает Виктор Малишевский о том времени, когда главным редактором была Юлия Слуцкая. *– В московском офисе всегда считалось, что белорусская команда – одна из самых крутых, которая, во-первых, приносила прибыль, во-вторых, делала очень качественный продукт. В Москве удивлялись, почему белорусские журналисты не переезжают в Москву или Питер. Но мы к этому никогда не стремились. У нас была своя политика. Во время работы с Юлей мы застали много проблем в отношениях Беларуси и России, например, газовые войны. И у нас была четкая установка: мы всегда стояли на белорусской стороне. Не просто не позволяли диктовать себе пророссийскую позицию – Юля делала так, чтобы этих разговоров даже не возникло. В этом смысле мы были максимально независимы.*

Бывшая журналистка «Комсомольской правды» в Беларуси» **Надежда Белохвостик** познакомилась с Юлией Слуцкой в 1998 году в одной из журналистских поездок.

– Тогда я работала в «Вечернем Минске», а Юля была главным редактором «Комсомолки» и собирала команду. Она меня позвала, но я пришла в газету позже – в самом начале 2000-х. Тогда это был небольшой вкладыш в российскую «Комсомолку». В результате за несколько лет газета выросла, и белорусские материалы составляли в ней половину контента.

В 2000-х годах «Комсомолка» стала одним из самых популярных печатных изданий Беларуси. Во многом благодаря тому, что Юлия была талантливым менеджером и редактором, считает Надежда Белохвостик.

– Она умеет собирать классную команду и руководить ей. И с ней всегда очень интересно работать.

– Что Юлия Слуцкая больше всего ценит в людях?

– В первую очередь профессионализм, желание работать, способность быть конструктивным, умение подставлять плечо и быть членом команды. Команда для нее очень важна. Это секрет успеха практически всех ее проектов.

В 2006 году Юлия Слуцкая ушла из «Комсомолки», хотя и не планировала этого. По словам Надежды, это было очень болезненно и для нее, и для всей редакции.

– Это стало последствием президентских выборов 2006 года. Тогда мы освещали их очень активно и подробно. Вели онлайны, которые только-только появлялись, предоставляли площадку для всех кандидатов в президенты. Мы старались давать максимально полную картину происходящего. В детали Юлиного ухода нас не посвящали. Но это был очень тяжелый момент и для нас, и для нее. Было ощущение, что земля ушла из-под ног. Команду обезглавили. Тем не менее благодаря тому, что она собрала и вырастила сильную команду, мы продолжали придерживаться тех же профессиональных стандартов.

«У краіне таталітарнай аднойчы ты разумееш: калі не я, то хто?»

Из «Комсомолки» Юлия Слуцкая ушла в никуда. В начале 2007 года ей предложили возглавить минское бюро «Еврорадио». В тот момент было много сомнений: смущала специфика радио и работа в некоммерческом СМИ, но она решила попробовать.

– Я не стварала гэтую каманду з нуля – яна ўжо была, калі я прыйшла. Але гэта была каманда вельмі нявопытная, няўмелая. Першыя месяцы я проста плакала над тэкстамі, якія мне прыносілі. Не магла сысці дахаты да 11–12 ночы, трэба было іх неяк перапрацоўваць. Але ў гэтым быў свой кайф, бо стаяла задача навучыць, – рассказывала Юлия Слуцкая в интервью Глебу Лободенко. *– Што я ўзяла з «Камсамолкі»? Ведаеце, журналістыка – заўсёды журналістыка. I тое, што спрацоўвала ў «Камсамольцы», спрацоўвала і на «Еўрарадыё». Былі асаблівасці, звязаныя са спецыфікай радыё, і тут мне самой давялося вучыцца, бо я ў гэтым не разбіралася.*

После того как Юлия Слуцкая покинула «Комсомольскую правду», решение уйти принял и Виктор Малишевский. С 2007 года они вместе работали на «Еврорадио».

Виктор вспоминает, что сразу после прихода на радио, которое вещало и писало на белорусском языке, Юлия также перешла на белорусский, чтобы между ней и редакцией не было барьера.

– Я, кстати, так и не смог. Нужно было себя перебороть. Если я скажу, что было невероятно трудно, то это будет самым подходящим определением. Думаю, не только для меня, но и для нее. Но она смотрела на эту ситуацию как на новый проект и новые возможности.

В 2010 году, когда возникло движение «Говори правду», выдвинувшее кандидатом на президентских выборах Владимира Некляева, Юлия взялась организовывать работу с медиа для кампании. Позже свое решение она объясняла так:

– У заходнім успрыманні пазіцыя журналіста і чалавека, які займаецца грамадскай дзейнасцю, – гэта розныя пазіцыі, і яны супярэчаць адна адной. Але ў краіне таталітарнай аднойчы ты разумееш: калі не я, то хто? Узнікла ідэя грамадзянскага руху «Гавары праўду», у якім былі мае добрыя знаёмыя і сябры. I мяне папрасілі арганізаваць працу з медыя – тым, у чым я разбіралася. У ніяк не была адным з кіраўнікоў, гэта смешна! Аднак я напраўду прыдумляла, планавала і потым ажыццяўляла працу кампаніі з медыямі.

Сразу после президентских выборов в офис «Еврорадио» пришли силовики, провели обыск и конфисковали технику. Юлия Слуцкая улетела в Варшаву.

– Пасля 19 снежня стан быў такі... Некалькі дзён не спалі, працавалі ў жывым эфіры на «Еўрарадыё»... Падзеі былі незвычайныя. Не ведаю, як хто, але мы такіх брутальных падзей не чакалі. Для мяне асабіста склалася так, што прэзідэнт «Еўрарадыё», можна сказаць, проста загадаў мне ехаць у Варшаву. Ён сказаў: «На два дні чакаю цябе ў Варшаве, і без размоў». Ехала я сапраўды на два дні – у швэдры і лыжных ботах, зубную шчотку толькі прыхапіла з сабой. Гэта было 21 ці 22 снежня. I ўжо калі я была ў Варшаве, падзеі сталі разгортвацца далей.

Зранку 24-га, на Раство, я збіралася вярнуцца ў Мінск, у мяне былі квіткі на самалёт. Я прыйшла ў аэрапорт, прайшла кантроль, у тым ліку пашпартны. I ўжо перад самым самалётам адкрыла інтэрнэт, стала чытаць навіны і зразумела, што большасць людзей, з якімі я працавала падчас гэтай выбарчай кампаніі, знаходзяцца ў турме КДБ. Да таго моманту я ведала, што ўжо прайшоў ператрус на офісе «Еўрарадыё», што канфіскавана ўся тэхніка ўключна з маім ноўтбукам.

I проста зразумела ў пэўны момант, што, вярнуўшыся, хутчэй за ўсё, з трапа самалёта паеду ў іншае месца. Не скажу, што вельмі проста даюцца такія рашэнні. Але ў той час я меркавала, што гэта часова, і не планавала заставацца ў Варшаве.

На протяжении нескольких лет Юлия Слуцкая жила в Варшаве. Там она создала Информационное бюро солидарности – его работа была нацелена на то, чтобы обращать внимание иностранных журналистов на Беларусь.

Спустя несколько лет, несмотря на опасение за свою безопасность, Юлия Слуцкая приняла решение вернуться домой.

В 2015 году в Минске она с нуля создала белорусский «Пресс-клуб» – это площадка, которая объединяет журналистов, предоставляет для них образовательные возможности и нетворкинг. С лекциями и тренингами в «Пресс-клубе» выступали известные аналитики, журналисты-расследователи, исследователи медиа.

Кроме этого, "Пресс-клуб" запустил несколько самостоятельных проектов. MediaIQ занимается мониторингом белорусских медиа на предмет соблюдения журналистских стандартов, признаков пропаганды и манипуляций. В 2018 году заработал первый в Беларуси акселератор для технологических стартапов в медиаиндустрии LaunchME. А относительно недавно был открыт новый проект – «Академия «Пресс-клуба», в которой журналисты и редакторы могут приобрести новые компетенции и запустить проекты.

22 декабря 2020 года в «Пресс-клуб» пришли силовики с проверкой «по фактам нарушений налогового законодательства Республики Беларусь». Спустя почти сутки Юлия Слуцкая и ее коллеги Алла Шарко, Сергей Ольшевский, Сергей Якупов, Петр Слуцкий нашлись в списках тех, кто содержится в ИВС на Окрестина.

– Репутация Юли в профессиональном сообществе безупречна. И она невероятна в общении. Во многом успех всех ее проектов обусловлен ее харизмой и обаянием, – рассказывает Надежда Белохвостик. *– Я никогда не видела ее кричащей. Всегда бывают сложные моменты, но Юля не решает их с помощью злости или агрессии. Мы знакомы более 20 лет. И все эти годы я вижу, что это человек, который может возрождаться и начинать все с нуля. Как она это делает – не знаю. В ней просто невероятное количество энергии.*

ПАРАЛЛЕЛИ

Украина: большой праздник по случаю 30-летия со дня провозглашения Независимости

Всё познается в сравнении. 30 лет назад Беларусь и Украина провозгласили государственную независимость. Две страны-соседки, которые были связаны между собой вековой историей, почти одновременно приняли Декларацию о независимости: Украина – 24-го, а Беларусь – 25 августа 1991 года. И если украинцы празднуют восстановление своей независимости, организовав настоящий, объединяющих всех большой праздник в кругу многочисленных друзей из разных стран, то нам в этом плане особо гордиться нечем. Похоже на то, что отсчет времени Независимости Беларуси у официальных лиц свой.

Можно тысячу раз говорить о том, что в Украине седьмой год идет война, но украинцы доказали, что они способны отстаивать свою независимость с оружием в руках. А у российских агрессоров, несмотря на превосходство, не получается оккупировать страну полностью, они получают достойный отпор.

Последняя неделя показала, с чем суверенная Украина подошла к празднованию своего тридцатилетия. Этот период был ознаменован рядом знаковых событий. 22 августа страну посетила Ангела Меркель, канцлер Германии. Ее приезда ждали с определенными опасениями. Некоторые эксперты предполагали, что она привезет от Владимира Путина своеобразный план капитуляции Украины. Но, отнюдь, глава правительства Германии сделала Украине подарок к 30-летию, публично признав, что фактически в стране нет гражданской войны и существует только две стороны военного конфликта – Российская Федерация и Украина, несмотря на то, что Кремль всячески увиливал от признания этого факта, стараясь доказать миру обратное. Это заявление в очередной раз подчеркивает: западные страны прекрасно понимают, что прекращение войны напрямую зависит от желания Российской Федерации.

На следующий день, 23 августа, в Киеве прошло достаточно репрезентативное международное мероприятие – «Крымская платформа». В Украину приехали представители 46 государств: президенты, премьер-министры и другие уполномоченные официальные лица. Как ни пыталась страна-агрессор убедить, всех и, вероятно, себя прежде всего, что у Украины ничего не получится, что мир давно смирился с оккупацией Крымского полуострова, но произошедшее событие опровергло эти утверждения.

Фактически Украина таким масштабным мероприятием впервые за семь лет оккупации Крыма поставила перед международным сообществом вопрос о деоккупации полуострова. И международное сообщество поддержало ее в этом, приняв по итогам конференции соответствующую декларацию, в которой Российская Федерация обозначена страной-оккупантом и агрессором. Официальные представители иностранных государств в своих выступлениях четко обозначали позиции: *«Международное сообщество не признает незаконную аннексию этой украинской территории»*.

Прошло не разовое пиар-мероприятие, как некоторые хотят это представить. Это будет полноценная, наполненная содержанием, постоянно действующая переговорная площадка. Участники мероприятия решили создать *«Международную Крымскую платформу как консультативный и координационный формат с целью мирного прекращения временной оккупации Российской Федерацией территории Автономной Республики Крым и города Севастополя и для восстановления контроля Украины над этой территорией в полном соответствии с международным правом»*.

Но на этой переговорной площадке будут подниматься вопросы не только по Крыму. Для белорусов она интересна еще и тем, что, по инсайдерской информации, в ее рамках планируется в дальнейшем обсуждение в том числе и белорусского вопроса, связанного с угрозой, исходящей от диктаторского режима. Будут вырабатываться совместные решения, как международному сообществу реагировать и что предпринимать в ответ на неадекватные действия государственных чиновников Беларуси.

Страна-агрессор Российская Федерация прогнозируемо проигнорировала персональное приглашение президента Украины Владимира Зеленского принять участие в столь представительном международном мероприятии и устами пресс-секретаря президента РФ Дмитрия Пескова обиженно заявила: *«Мы относимся к этому мероприятию как к чрезвычайно недружественному по отношению к нашей стране. Мы категорически не приемлем подобные утверждения в отношении российского региона, в отношении Крыма. В этом плане отношение абсолютно однозначное – относимся как к антироссийскому мероприятию»*.

Многие официальные международные представители, включая первых лиц, 24 августа приняли участие в мероприятиях, посвященных тридцатилетию независимости Украины. Президенты Литвы, Латвии, Эстонии, министр иностранных дел Франции, а также православный Вселенский Патриарх Варфоломей присутствовали на грандиозном военном параде, в котором участвовал весь силовой блок Украины: армия, различные спецслужбы, Национальная гвардия, полиция, госслужбы по чрезвычайным мероприятиям и представители военных стран-союзников, в том числе входящих в блок НАТО. Тем самым союзники подчеркнули, что в случае продолжения агрессии Украина не останется одна и ей будет оказана помощь в том или ином масштабе. Парад прошел на суше, на море (в Одессе) и в воздухе.

После официальной части состоялось шествие, в котором приняли участие десятки тысяч человек – представители украинского гражданского общества. По центральной улице столицы прошли около 70 колонн, состоящих из ветеранов войны, представляющих различные добровольческие структуры, представителей объединения военных медиков, военных капелланов разных конфессий, волонтеров, репрессированных, родных и близких погибших на российско-украинской войне, Муниципальной варты Киева, всех областей страны… В многотысячном шествии принимала участие и белорусская колонна с флагами и историческими национальными символами, которую весьма тепло приветствовали украинцы.

События последних дней показали, что, несмотря на все существующие проблемы, украинцы не сломлены духом, готовы жертвовать собой ради защиты государства от агрессоров и не одиноки – в стремлении защитить и построить сильное независимое государство их поддерживает международное сообщество.

Александр ЦЫНКЕВИЧ,
собственный корреспондент «Народной Воли» в Украине.






















КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Муж з любошчамі не лез, дык і здарыўся эксцэс

Дырэктар мінскага секс-шопа праз папулярны сайт звярнуўся да маладзіцы з просьбай, каб яна вярнула ці аплаціла (63 рублі 90 капеек) украдзены фалас – гэта зафіксавала відэакамера. За два гады працы секс-шопа крадзеж там адбыўся ўпершыню.

Нам спярша належнае аддам:
Мы – цывілізацыя, Еўропа.
І таму, само сабою, нам
Нельга абысціся без секс-шопа.
Хто наведваў Вену, Амстэрдам,
Той пераканацца мог, вядома:
На вітрынах, на прылаўках там
Фаласы ляжаць, нібы салома, –
Выкладзены людзям напаказ.
Ды не лыкам шыты мы таксама:
З гонарам даводжу, што і ў нас
У сталіцы ёсць такая крама.
Мінск – не Бухарэст і не Парыж,
Ды хоць выбар тут і не багаты,
Пахадзіўшы полкамі паміж,
Кожны з чымсьці вернецца дахаты.
А нядаўна здарыўся эксцэс
У тутэйшай эратычнай краме.
Пэўна, муж з любошчамі не лез,
Сексу не хапала гэтай даме.
І ў секс-шопе сціброла яна
Тое, чым валодае мужчына.
Атрымае, мусібыць, спаўна –
З сексам зараз будзе годна-чынна.
Дзіўната, здавалася б, няма:
Хочацца любому чалавеку
Атрымаць якуюсь рэч дарма.
Ну а кралі ўвогуле спрадвеку
Людзі «недапечаныя» з крам.
У зладзеяў розныя замашкі:
Хто скрадзе сасісак кілаграм,
Хто – «чарніла» тры-чатыры пляшкі;
Некага схапілі за руку,
Для кагосьці быў крадзеж удалы…
Толькі не бывала на вяку,
Каб з секс-шопа кралі прычындалы.
То не выпадковасць, а сімптом –
Гэта трэба нам прызнаць адкрыта.
І не дзіва, што прынесла ў дом
«Інструмент» жанчына менавіта…

***

Ну а вывад просіцца які?
Што сказаць у якасці маралі?
То для нас званочак, мужыкі:
Дрэнна мы ўвіхацца ў ложку сталі…

Падказка маладым

Хаця мой вопыт адкрыццём не стане,
Ды ўсё-ткі дам падказку маладым,
Што чым павольней на гулянцы танец,
Тым карацей прэлюдыя затым…

Гарантыя

Калі ты лічыш, што жаніўся ўдала,
Год пачакай (пагуода вельмі мала).
Якраз тады гарантыя міне,
І зразумееш, так яно ці не.

На дыеце

Не спалася ноччу ад нейкай нуды,
Мой розум вярэдзіла думак лавіна.
Пайшоў я на кухню, каб выпіць вады,
А там на дыеце сядзіць «палавіна»…

Бессаромнік

Кабета гнеў свой стрымлівае ледзь,
Пагляд не падабаецца кабеце.
– Мужчына! Перастаньце так глядзець!
Сумлення ў вас няма!
Вакол жа дзеці…

Прыгажун

Сказала мне знаёмая дзяўчына:
– Бывае, на мужчыну я зірну,
І ўжо пагляд адвесці немагчыма –
Няма цаны яму, прыгажуну.
Не супраць я з такім у загс папасці,
Мы з ім, здаецца, цэлае, адно.
І так грукоча сэрцайка ад шчасця,
Што ліфчык расшпіляецца ажно…

Вушам не паверыла

Пакуль не прачытаў малітву поп,
Прамовы прагучалі каля ямы –
Нябожчыка хвалілі наўзахлёб:
– Запомніцца як справядлівы самы…
– Харошы муж…
– Быў мудрым, як сава…
– Навек у нашых сэрцах след пакіне…
І дзівячы падыходзіла ўдава:
А хто ляжыць усё-ткі ў дамавіне?

Без грошай ты здаровы

– Доктар, грошы ў мяне на выхадзе.
За лячэнне я ў будучым годзе
Больш плаціць, як раней, не гатовы…
– Вельмі добра, што вы ўжо здаровы!

ТАМ, ЗА КРАТАМІ

«Андрэй трымаецца на старых запасах лекаў»

***Аксана ПАЧОБУТ**, жонка гродзенскага журналіста, які зараз знаходзіцца за кратамі, распавяла «Народнай Волі» пра апошнія навіны ад мужа.*

Палітвязню **Андрэю Пачобуту** падоўжылі тэрмін утрымання пад вартай яшчэ на тры месяцы.

Нагадаем, што журналіста затрымалі 25 сакавіка. Пазней стала вядома, што яго абвінавачваюць у «распальванні расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці іншай варожасці». Ён апынуўся ў зняволенні па так званай «справе палякаў», калі былі затрыманы некалькі актывістаў незарэгістраванага Саюза палякаў Беларусі, у тым ліку кіраўнік арганізацыі **Анжаліка Борыс**.

– У апошнім лісце Андрэй напісаў, што ён да крыві параніўся пры галенні, – кажа **Аксана Пачобут**. – *Гэта і засмучае, і непакоіць, бо ў камеру да мужа пасадзілі ВІЧ-інфікаванага чалавека.*

Больш нічога важнага не паведамляе. Пісаў, што ў камеры быў чалавек,



якога за нейкі каментарый у інтэрнэце абвінавачваюць па палітычным артыкуле, але яго хутка перавялі ў іншае месца. У астатнім сакамернікі – гэта людзі, якія праходзяць па звычайных крымінальных артыкулах.

Андрэй Пачобут перахварэў у ізалятары на каранавірус, да таго ж у яго хворае сэрца, таму блізкія перадаюць яму лекі.

– Перадаём усё тое, што можна набыць без рэцэпта, – дадае жонка палітвязня. – *З рэцэптамі складаней, бо нават турэмны урач патлумачыў, што ён не мае паўнамоцтваў іх выпісваць. І нават бланкаў у яго няма. Таму пакуль яшчэ Андрэй трымаецца на старых запасах лекаў, якія прадаюць толькі па рэцэпце, а далей будзе складаней.*

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

ГРАМАДСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

Стаміліся чакаць – упарадкавалі дарогу за свой кошт

Частка жыхароў вуліцы Баліцкага ў пасёлку Паўднёвы, што ў Гродне, скінуліся на добраўпарадкаванне дарогі насупраць сваіх дамоў. Надакучыла чакаць, пакуль гэта зробяць мясцовыя ўлады. Іншыя паглядзелі і маюць намер зрабіць тое самае. Але ёсць і тыя, хто кажа: чаму жыхары горада павінны добраўпарадкоўваць дарогі агульнага карыстання за свой кошт?

Асфальт праклалі толькі да генеральскага дома

Пасёлак Паўднёвы, як прынята яго называць, – мікрараён Гродна з прыватнай забудовай. Вуліца Баліцкага праходзіць паралельна адной з цэнтральных. Першыя дамы на Баліцкага з'явіліся больш за 30 гадоў таму.

Мясцовы жыхар Юрый распавядае, што нармальную дарогу зрабілі толькі да так званага генеральскага дома. Яшчэ ў 1990-я ў ім жыў начальнік Гродзенскай абласной міліцыі генерал Белашэўскі. Дом, які знаходзіцца на пачатку вуліцы, адметны тым, што да яго пракладзены асфальт, а ў двары стаіць вялікая антэнная вышка.

– Вось да яго дома асфальт праклалі, а для нас усіх – не хапіла, – скептычна заўважае Юрый.

Дарэчы, пра тое, што дарогу праклалі толькі да генеральскага дома, распавядаюць усе жыхары вуліцы, з кім даводзілася размаўляць.

Юрый успамінае: некалькі гадоў жыхары вуліцы спрабавалі дамагчыся, каб ім праклалі асфальт, але хутка зразумелі бесперспектыўнасць задумкі. Дарэчы, большасць вуліц мікрараёна не заасфальтавана, і ніхто не спяшаецца гэта рабіць.

– Машыну пямыеш, паставіш, а праз пару гадзін яна ўся ў пыле. Дождж пройдзе – і месіш зямлю, – эмацыйна распавядае мужчына. – *Ды што ў нас – нават там, дзе дамы значна раней былі пабудаваны, ніхто пра асфальтаванне не гаворыць.*

Ягоная суседка спадарыня Алена, якая жыве на вуліцы Баліцкага больш за 10 гадоў, кажа, што спрабавала звярнуцца на «гарачую лінію» мясцовага тэлебачання, размаўляла з гарадскімі чыноўнікамі, тэлефанавала дэпутату:

– Я ўсім задавала пытанне: чаму нам, такім самым, як усе, падаткаплацельшчыкам, у мікрараёне, якому больш за 30 гадоў, не пракладваюць асфальтаваную дарогу? У гарвыканкаме патлумачылі, што зараз у мікрараёнах з прыватнай забудовай асфальтаваныя дарогі за кошт дзяржавы не робяць.

Чыноўнікі падлічылі, паведамляе спадарыня Алена, што, калі рабіць паўнавартасную дарогу з асфальтавым пакрыццём за сродкі грамадзян, яна можа абысціся ў 1700 рублёў з кожнага дома.

– Сума непад'ёмная, а дамагчыся, каб заплаціў кожны дом, – гэта наогул нерэальна, – упэўнена жанчына. – *У нас на працягу двух пяцігодак існуе дзяржаўная праграма на будаўніцтве і рэканструкцыі дарог, але мы гэтага ніяк не адчулі.*

Нічога асаблівага не прыдумвалі

Паколькі дамовіцца з усімі жыхарамі вуліцы адразу не ўдалося, некалькі суседзяў вырашылі скінуцца і ўпарадкаваць хаця б дарогу насупраць сваіх дамоў.

– Мы асабліва нічога не прыдумвалі, а паехалі ў «Рэмбудаўтадар», – *набылі 200 тон перапрацаванай са старога асфальту крошкі, напісалі заяву, каб прыехала дарожная тэхніка, і ўсё,* – распавядае спадар Сяргей. – *На 15 метраў упарадкавання дарогі ідзе 20 тон крошкі.*

Перапрацаваная са старога асфальту крошка па цане аказалася даступнай – 5 рублёў за тону, а вось за выкарыстанне тэхнікі рахунак пакуль не выставілі. Тым не менш у дамоўлены час прывезлі крошку, прыехаў грэйдар, асфальтавы каток і літаральна за некалькі гадзін дарога набыла зусім іншы выгляд.

Адзін з маіх суразмоўцаў кажа, што, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, за работу тэхнікі давядзецца заплаціць па 350 рублёў з дома.

Трэба рабіць хоць так, бо іншага можа і не быць

Калі прыехала дарожная тэхніка і прывезлі асфальтавую крошку, шмат каго з жыхароў вуліцы гэта зацікавіла. Мае суразмоўцы распавядаюць, што людзі хадзілі і цікавіліся, хто і на якіх умовах гэта робіць.

Спадар Міхаіл, да дома якога насыпалі крошку, сабраў сваіх суседзяў, і яны таксама пагадзіліся такім чынам упарадкаваць дарогу насупраць сваіх дамоў:

– Мы ўжо таксама напісалі заяву ў «Рэмбудаўтадар» і набылі асфальтавую крошку. Многія цяпер хочуць такім чынам упарадкаваць дарогу перад хатай, але не ўсе на вуліцы пагаджаюцца.

Спадарыня Валянціна кажа, што атрымлівае пенсію 280 рублёў, муж памёр, а сыны жывуць далёка, то, маўляў, і паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні дарогі яна не ў стане.

Спробы «Народнай Волі» высветліць у кіраўніцтва «Рэмбудаўтадара» ўмовы выканання работ па добраўпарадкаванні гарадскіх вуліц вынікаў не далі. Намеснік дырэктара **Юрый Лаціеў** адказаў, што не займаецца гэтымі пытаннямі, а галоўны інжынер **Валерый Клыбік** спаслаўся на занятасць.

Міхал КАРНЕВІЧ.

Гродна.

НАВІНКА

У 100 школах Мінска запрацуюць «разумныя буфеты»

Што гэта такое?

У шэрагу школ сталіцы купіць булачку або ёгурт у буфеце дзіця зможа з дапамогай асабістага QR-кода.

Аб гэтым паведаміла *«Мінск-навінам»* дырэктар Камбіната школьнага харчавання (КШХ) **Надзея Лукашэвіч**:

– «Разумны буфет» прадугледжвае безнаяўны разлік за буфетную прадукцыю па карце навучэнца ці з рахунка за харчаванне, які папаўняюць бацькі праз АРІП. Для гэтага яны павінны стварыць для свайго дзіцяці індывідуальны QR-код. Інструкцыю можна паглядзець на сайце КШХ.

Працуе гэта так: калі вучань купляе нешта ў буфеце, для разліку прыкладвае да спецыяльнага счытвальніка свой код. Яго можна раздрукаваць на папяровым носьбіце, сфатаграфаваць на смартфон або, напрыклад, нанесці на бірульку. Код прывязаны да фатаграфіі: буфетчык бачыць на планшэце здымак дзіцяці – так праходзіць ідэнтыфікацыя. Ніхто, акрамя канкрэтнага вучня, не зможа больш скарыстацца яго асабістым QR-кодам. Грошы аўтаматычна спісваюцца з рахунка навучэнца.

Паводле слоў Надзеі Лукашэвіч, пілотны праект ужо прайшоў у мінулым навучальным годзе апрабацыю на базе некаторых школ Партызанскага раёна. Бацькам і дзецям ідэя спадабалася.


Плюсаў шмат. Па-першае, дзеці могуць не насіць з сабой наяўныя грошы, па-другое, павялічылася хуткасць разліку ў буфеце, а па-трэцяе, бацькі могуць адзначаць у спецыяльным дадатку, якія стравы дзіцяці можна купляць, а ад якіх варта ўстрымацца. Гэтая опцыя асабліва карысная, калі ў школьніка ёсць індывідуальныя абмежаванні, якія патрабуюць выключыць з сілкавання пэўныя прадукты.

Мяркуецца, што з 1 верасня 2022 года «разумныя буфеты» будуць ва ўсіх школах Мінска.

ЧУЛІ?

Павел Севярынец заклікаў святароў весці набажэнствы па-беларуску хаця б раз на тыдзень

*Зварот палітвязня, асуджанага на сем гадоў, змясціла на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку» яго жонка **Вольга Севярынец**.*



«Паважаныя святары, пастары, вернікі! Прыйшоў час сказаць пра набажэнствы ў беларускіх цэрквах па-беларуску.

Сярод відавочных прычын нашай сённяшняй бяды – адмаўленне ад дадзенай Богам мовы. Госпад даў кожнаму народу сваю ўласную мову – каб прадухіліць пабудову сусветнай імперыі зла і паставіць заслон грэху агульначалавечай пыхі», – *кажа Павел.*

«Няхай усё пачнецца хаця б з аднаго беларускамоўнага набажэнства на тыдзень. Бог дапаможа і натхніць людзей. Няўжо беларусы не вартыя аднаго беларускамоўнага набажэнства на 7 дзён, браты? Няўжо так і будзем маліцца да Бога не па-беларуску?

Бог даў нам мову – а мы адмаўляемся ды грэбліва адкідаем яе.

Час пакаяцца за тое, што выракліся Божага дару, – і стварыць плод, варты пакаяння. Ёсць жа цудоўныя праваслаўныя і евангельскія супольнасці, дзе беларуская мова квітнее! Перамайцы!» – *зазначыў Павел Севярынец.*

АПЫТАНКА

Дырэктары расказалі Нацбанку пра сітуацыю на заводах

Нацбанк Беларусі выпусціў чарговы аналітычны агляд «Маніторынг рэальнага сектара эканомікі», у якім сярод іншага ёсць вынікі апытання кіраўнікоў прадпрыемстваў. Вось якія лічбы, што сведчаць аб чаканнях кіраўнікоў, адзначаны ў дакуменце.

Якія чыннікі, на думку кіраўнікоў прадпрыемстваў, абмяжоўваюць рост вытворчасці:

недахоп грашовых паступленняў для фінансавання дзейнасці – 45,7%;
неплацяжы спажыўцоў – 44,9%;
недахоп абаротных сродкаў – 42,4%;
недастатковы попыт на прадукцыю – 35,7%;
высокія цэны на сыравіну, матэрыялы, тавары – 34,3%.

Недастатковасць абаротных сродкаў у маі–ліпені адзначылі 54,2% прадпрыемстваў – удзельнікаў маніторынгу (у лютым–красавіку такіх было 56,7%).

Росту спажывецкіх цэн чакаюць 89,8% рэспандэнтаў, з іх:

рост коштаў не зменіцца – 49,4%;
рост коштаў паскорыцца – 31,2%.

Акрамя таго, да кастрычніка ўдзельнікі апытання чакаюць зніжэння курсу рубля да долара і запаволення яго зніжэння да расійскага рубля.



РЯДОМ С КОМПЕТЕНТНЫМ СОБЕСЕДНИКОМ

Афганистан: страницы истории и день сегодняшний

Прямо сейчас весь мир обсуждает Афганистан, который, после того как США вывели свои войска, всего за пару недель захватили исламисты из «Талибана». Что будет с этой страной дальше – решительно не ясно, поэтому давайте поговорим о том, почему происходящее вообще стало возможным. А поможет нам в этом **Александр ШЛЫК** – человек, чьей работой много лет было устраивать выборы и наблюдать за ними, в том числе и в Кабуле.

Кто такой Александр Шлык

Александр Шлык – эксперт по выборам, который в феврале этого года присоединился к команде Светланы Тихановской. До этого он десять лет работал в отделе по выборам БДИПЧ ОБСЕ, с 2016 года был его главой. Александр руководил командой, которая наблюдала за всеми выборами в регионе ОБСЕ.

Кроме прочего, Шлык наблюдал за выборами и в Афганистане – стране, которую захватили исламисты из «Талибана», после того как Штаты вывели оттуда свои войска. Александр посещал Кабул в 2009-м, 2014-м и 2018 годах. Лично встречался с Ашрафом Гани, который был президентом страны с 2014-го, пока не сбежал из нее в августе 2021 года, когда пришли талибы. Далее – наш разговор с экспертом о прошлом, настоящем и будущем Афганистана.



Фото из аэропорта Кабула после захвата «Талибаном» власти в стране.

Путь от хиппи до солдат: как и почему менялась страна

– То, что последние дни происходило в Кабуле, вызывает ужас. Особенно кадры из аэропорта: люди цепляются за взлетающие самолеты, падают и разбиваются насмерть.

– Я состою в неформальной группе в «Фейсбуке» и вижу, как люди, которые знают афганцев лично, пытаются координированно им помочь исчезнуть из страны. В Кабуле очень многие работали при посольствах, были переводчиками не только в политических проектах, но и в частном бизнесе. Работали в проектах развития, куда были вложены немецкие, французские деньги. Эти люди сейчас боятся за свое будущее.

– Почему они не начали бояться тогда, когда США вывели из Афганистана свои войска?

– Они начали бояться давно, потому как понимали, что приход талибов после вывода американских войск – вопрос времени. Проблема в том, что никто не ожидал, что это произойдет настолько быстро.

Талибы уже правили в Афганистане с 1996-го до 2001 года, пока не пришли войска НАТО. Я как-то жил на натовской базе в Кабуле, она находилась возле аэропорта – сейчас смотрю на кадры оттуда и узнаю эти места. Это было в 2014-м, когда я курировал Афганистан от ОБСЕ по вопросам выборов. У меня тогда была команда из 15 человек и охрана. Я прилетал в Кабул раз в 2–3 недели.

– А женщины были в этой команде?

– Конечно. Во всех командах ОБСЕ женщин и мужчин примерно равное количество.

– С чего хотелось начать наш разговор: белорусский блогер Леонид Пашковский выпустил фильм о Кабуле, снятый буквально месяц назад, – кажется, что этот город вполне подходил для туризма, пока туда не пришли талибы. Это так?

– Должен сознаться: на улицах Афганистана я ни разу не был. У меня было так: выходишь из самолета, тебя сажают в броневик вместе с охранником. Надевают на тебя каску и бронежилет и везут в отель или на базу. Туда ты заезжаешь через трое ворот, вокруг стоят охранники с автоматами – всё как положено. Машину обыскивают с собаками, сначала выходит охранник, и только потом ты сам. Но даже дверь самостоятельно тебе открыть не дают.

На улице за всё время я был, наверное, один раз. Хотя сложно назвать прогулкой процесс, когда вокруг тебя восемь охранников. Но я видел Кабул из окна броневика – многие улицы там похожи на рынок, торговля идет вообще везде. И люди в этом городе приветливые и адекватные. Нет такого, что ты едешь, а на тебя «Калашникова» наставляют.

Но нас тренировали по вопросам безопасности: даже сидя в машине, в Афганистане ты должен быть, что называется, на стрёме. Если расслабишься, скорее всего, тебя тепленьким и возьмут, потому что перестанешь следить за тем, что происходит вокруг.

– В какой одежде ты ходил?

